**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у IX клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі у кадэцкіх вучылішчах**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

## Валошка

У свеце існуе вялікае мноства відаў валошак самых розных колераў: блакітныя, сінія, ружовыя, жоўтыя, белыя, ліловыя. Але для беларусаў самай вядомай і звыклай з’яўляецца менавіта валошка сіняя. Яна справядліва лічыцца нашай нацыянальнай кветкай, адным з сімвалаў Беларусі. Ёй прысвячаюць вершы і песні беларускія паэты. Узор валошкі вышываюць на ручніках, абрусах, хустках.

Хоць гэтая кветка лічыцца пустазеллем у хлебным полі, ніхто не асмеліцца назваць яе шкоднай ці непатрэбнай. І не толькі таму, што блакітныя зорачкі валошкі аздабляюць летні пейзаж. Здаўна з яе пялёсткаў рабілі цудоўную сінюю фарбу. А яшчэ валошка з яўляецца вядомай лекавай раслінай. Людзі выкарыстоўвалі яе як добры сродак ад прастуды, хваробаў скуры і вачэй, печані, нырак, нерваў.

Кветкаводы вывелі некалькі відаў валошак, якія вельмі аддалена нагадваюць звыклую сінюю жытнёвую валошку. *(122 словы)*

*Паводле Я. Грынчанкі, А. Церашковай*